І.М. Зуева

БЕЛАРУСКАЯ МОВА (прафесійная лексіка)

Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў факультэта фізічнай культуры і спорту

2006

Репозиторий ВГУ

УДК 808.26-3(075.8)
ББК 81.411.3-923
З-91

Аўтар: старшы выкладчык кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **І.М. Зуева**

Рэцэнзент: дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, кандыдат філалагічных навук Г.К. Семянькова

Репозиторий ВГУ

Вучэбна-метадычны комплекс прызначаны для студэнтаў факультэта фізічнай культуры і спорту дзённай і завочнай форм навучання і ўключае: 1) тэматычны план курса; 2) тэарэтычныя звесткі; 3) заданні, практыкаванні і тэставы кантроль для замацавання тэарэтычнага матэрыялу; 4) тэксты для аналізу і развіцця мовы; 5) тэксты для перакладу і засваення асобных тэм па спецыяльнасці; 6) тэмы вусных выказванняў для назапашвання і прымянення студэнтамі спецыяльнай тэрміналогіі з вобласці спорту, спартыўнай гігіены і анатоміі; 7) кантрольную работу для студэнтаў АЗН; 8) пытанні да заліка для студэнтаў дзённага аддзялення і АЗН.

УДК 808.26-3(075.8)
ББК 81.411.3-923

© Зуева І.М., 2006
© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2006

П Р А Д М О В А

Высокая моўная культура – неад'емная частка падрыхтоўкі кожнага спецыяліста. У наш час мова прызнана ў грамадстве важным інструментам інфармацыйнага ўздзеяння. Ва ўмовах білінгвізму ў Рэспубліцы Беларусь павышаецца матывацыя публічнай маўленчай дзейнасці, што патрабуе ад вышэйшай школы рыхтаваць не проста спецыяліста, а камунікатыўна развітую асобу, якая на дастаткова высокім узроўні магла б наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай (і не толькі) сферы.

У адпаведнасці са стандартамі па цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі распрацавана праграма "Беларуская мова. Прафесійная лексіка".

З улікам запатрабаванняў жыцця навучанне па згаданай дысцыпліне грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі, арыентацыі на агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці, творчы характар засваення прадмета і індывідуальны падыход да студэнтаў.

У аснову праграмы "Беларуская мова. Прафесійная лексіка" пакладзены сітуацыйна-камунікатыўны прынцып, арыентаваны на перспектыўную запатрабаванасць атрыманых камунікатыўных навыкаў.

Зыходзячы з прынцыпаў камунікатыўнасці і перспектыўнасці, вызначаны сферы маўленчай дзейнасці, паводле якіх арганізаваны і ўладкаваны ўвесь практычны моўны матэрыял дадзенага вучэбна-метадычнага комплексу, прызначанага для студэнтаў факультэта фізічнай культуры і спорту дзённай і завочнай форм навучання.

Тэмы камунікатыўнага накірунку і неабходны для іх забеспячэння моўны матэрыял, на аснове якога і ажыццяўляюцца ўсе віды маўленчай дзейнасці, вызначаюцца паводле будучай спецыяльнасці студэнтаў згаданага факультэта.

"Беларуская мова (прафесійная лексіка)" – гэта ў аснове сваёй практычны курс. Але некаторыя тэарэтычныя пытанні раздзелаў "Уводзіны", "Лексіка", "Арфаэпія", "Арфаграфія", "Граматыка" патрабуюць лекцыйнага выкладу, таму яны ў сціслай форме прапанаваны ў табліцах і схемах. На занятках гэтыя пытанні пашыраюцца, паглыбляюцца і замацоўваюцца практычна на канкрэтным моўным матэрыяле (заданні, практыкаванні, тэставы кантроль, тэксты для аналізу і развіцця мовы). Прапанаваныя для перакладу тэксты навуковага характару выкарыстоўваюцца для развіцця вуснага маўлення і засваення асобных тэм па спецыяльнасці, а тэмы вусных выказванняў садзейнічаюць грунтоўнаму засваенню спецыяльнай лексікі з вобласці спорту, спартыўнай гігіены і анатоміі. Тэматыка тэкстаў для практычных заняткаў дапамагае выхоўваць у студэнтаў пачуццё нацыянальнай і асабістай самапавагі, любоў да мастацкага слова, да духоўнай і інтэлектуальнай культуры беларусаў.

Репозиторий ВГУ

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА

I. Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў.
Тэорыя і методыка фізічнага выхавання.

II. Беларуская мова – нацыянальная мова беларусаў.
Спартыўная трэніроўка і навукова-даследчая работа.

III. Нормы беларускай літаратурнай мовы.
Віды спорту: барацьба, гімнастыка, лёгкая і цяжкая атлетыка, плаванне і іншыя.

IV. Функцыянальныя стылі літаратурнай мовы.
Спартыўныя каманды.

V. Асаблівасці навуковага стылю мовы. Беларуская навуковая тэрміналогія. Спартыўныя гульні.

VI. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.
Беларускія народныя гульні.

VII. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі.
Фізічная культура ў Рэспубліцы Беларусь.

VIII. Сістэма часцін мовы.
Спорт у Рэспубліцы Беларусь.

IX. Асаблівасці будовы некаторых словазлучэнняў у беларускай мове (у параўнанні з рускай).
Заканадаўчая база фізкультурна-спартыўнай дзейнасці сучаснай Беларусі.

Репозиторий ВГУ

ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ЗВЕСТКІ Ў ТАБЛІЦАХ І СХЕМАХ

Тэма: Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў

Славянскія мовы (больш як 290 млн. чал.)

Заходнеславянскія мовы	Усходнеславянскія мовы	Паўднёваславянскія мовы
Польская (каля 44 млн.) Чэшская (12 млн.) Славацкая (5 млн.) Лужыцкая (пад 100 тыс.) (верхне- і ніжнелужыцкая) Палабская (мёртвая)	Беларуская (больш як 10 млн.) Руская (звыш 200 млн.) Украінская (каля 41 млн.)	Балгарская (9 млн.) Македонская (2 млн.) Сербская (13,5 млн.) Харвацкая (7 млн.) Славенская (звыш 2 млн.) Стараславянская (мёртвая)

Тэма: Беларуская мова – нацыянальная мова беларусаў

Беларуская нацыянальная мова

Дыялектная мова

Сукупнасць мясцовых гаворак, што бытуюць (у вуснай форме) на Беларусі. На аснове падабенства гаворкі аб'ядноўваюцца ў тэрытарыяльныя дыялекты.

- **Паўночна-ўсходні дыялект**
- **Сярэднебеларускія гаворкі (абапал лініі Ашмяны-Мінск-Бабруйск-Гомель)**
- **Паўднёва-заходні дыялект**

Літаратурная мова

Вышэйшая, унармаваная, стылістычна разгалінаваная, абавязковая для ўсіх носьбітаў мовы.

- **Вусная разнавіднасць**
- **Пісьмовая разнавіднасць**

Функцыянальныя стылі

Размоўна-гутарковы	Публіцыс-тычны	Навуковы	Афіцыйна-дзелавы

Стыль мастацкай літаратуры

Своеасаблівая форма літаратурнай мовы, якая не толькі ажыццяўляе зносіны з чытачом (слухачом), але і эстэтычна ўздзейнічае на яго. У якасці вобразна-выяўленчых сродкаў можа выкарыстоўваць элементы ўсіх астатніх стыляў.

Рэпозиторий ВГУ

Тэма: Нормы беларускай літаратурнай мовы

Сістэма нормаў літаратурнай мовы	
Норма – выпрацаваныя грамадствам і пісьмова замацаваныя ў нарматыўных слоўніках, даведніках, граматыках узоры, правілы выбару, вымаўлення і напісання слоў, ужывання граматычных формаў, пабудовы словазлучэнняў і сказаў.	
Арфаэпічныя	правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў у словах
Акцэнтуацыйныя	правілы пастаноўкі націску ў словах
Арфаграфічныя	правілы перадачы вуснай мовы на пісьме
Лексічныя	правілы ўжывання слоў ва ўласцівых ім значэннях і правільнае спалучэнне слоў па сэнсе
Словаўтваральныя	правілы ўтварэння слоў
Марфалагічныя	правілы ўтварэння формаў слоў
Сінтаксічныя	правілы граматычнай сувязі ў словазлучэннях і пабудовы сказаў
Пунктуацыйныя	правілы пастаноўкі знакаў прыпынку
Стылістычныя	правілы ўжывання моўных сродкаў (слоў, словазлучэнняў, сказаў) у адпаведнасці з выбраным стылем
Этычныя	правілы маўленчых паводзін, вызначаныя маральна-этычнымі традыцыямі нацыі

Репозиторий ВГУ

Тэма: Функцыянальныя стылі літаратурнай мовы

Характарыстыка функцыянальных стыляў

Стыль	Сфера прымянення	Мэты зносін	Асноўныя віды тэкстаў	Асноўныя рысы стылю	Асноўныя моўныя сродкі
Размоўна-гутарковы	Быт, сямейныя і сяброўскія зносіны.	Абмен думкамі, інфармацыяй, уражаннямі з блізкімі і знаёмымі людзьмі.	Гутаркі (дыялогі), запіскі, лісты блізкім людзям.	Натуральнасць, жывасць, непасрэднасць маўлення, адсутнасць строгай лагічнасці, эмацыянальнасць.	Ацэначны характар моўных сродкаў (прастамоўныя словы, дыялектная і жаргонная лексіка, словы з пераносным значэннем і інш.). Часціцы, выклічнікі: *ах, ой, вось, дык, ну, хай, гэй.* Пытальныя, пабуджальныя і клічныя сказы. Няпоўныя сказы: словы-сказы, звароткі.
Навуковы	Навука, тэхніка, вучэбны працэс, вытворчасць.	Паведамленне аб дасягненнях у розных галінах навукі і тэхнікі. Афармленне навуковых звестак у працэсе даследавання. Арганізацыя вучэбнага працэсу.	Навуковыя выступленні; лекцыі, дыспуты. Рэфераты, артыкулы, тэзісы, дысертацыі, падручнікі.	Дакладнасць, доказнасць, лагічнасць, сціслась, пэўная сухасць маўлення. Асноўная форма – маналог.	Навуковыя тэрміны, кніжная лексіка. Адсутнасць эмацыянальна афарбаванай лексікі. Адсутнасць слоў з пераносным значэннем. Апавядальныя простыя і складаныя сказы. Канструкцыі з умоўна-выніковымі, прычыннымі і часавымі адносінамі. Пабочныя і ўстаўныя словы, словазлучэнні і сказы.

Репозиторий ВГУ

Стыль	Сфера прымянення	Мэты зносін	Асноўныя віды тэкстаў	Асноўныя рысы стылю	Асноўныя моўныя сродкі
Афіцыйна-дзелавы	Афіцыйныя зносіны: справаводства, галіна права і заканадаўства.	Рэгуляцыя афіцыйных адносін: перадача афіцыйнай інфармацыі; загады, распараджэнні; вызначэнне правоў і абавязкаў.	Службовыя паперы: даведка, справаздача, пратакол, заява, характарыстыка, аўтабіяграфія, даверанасць, распіска і інш.) Дагаворы, законы.	Афіцыйнасць, строгая дакладнасць і канкрэтнасць. Адсутнасць эмацыянальнасці. Асноўная форма – пісьмовы маналог.	Словы-назвы афіцыйных асоб, устаноў, дакументаў. Словы толькі з прамым значэннем. Адсутнасць эмацыянальна афарбаванай лексікі. Стандартныя канцылярскія выразы і звароты. Апавядальныя простыя і складаныя сказы, ускладненыя аднароднымі і адасобленымі членамі.
Публіцыстычны	Грамадскае жыццё, палітыка, ідэалогія, СМІ.	Інфармаванне пра грамадска-палітычныя справы. Уздзеянне на пачуцці і свядомасць людзей з мэтай перакананння іх у пэўных поглядах і ідэях.	Выступленні, лекцыі, дыспуты на грамадска-палітычныя тэмы. Газетныя і часопісныя артыкулы. Інфармацыя, рэпартаж.	Натуральнасць, жывасць, даходлівасць, эмацыянальнасць (палымянасць) маўлення. Асноўная форма – дыялог.	Грамадска-палітычная і эмацыянальна-экспрэсіўная лексіка. Словы з прамым і пераносным значэннем. Пабуджальныя, клічныя сказы. Звароткі. Рытарычныя пытанні, звароты, паўторы.
Мастацкі	Мастацкая літаратура і вусная народная творчасць.	Інфармаванне аб духоўным вопыце чалавецтва, эстэтычнае ўздзеянне на ўнутраны свет чалавека.	Жанры мастацкай літаратуры (вершы, байкі, казкі, апавяданні, аповесці, камедыі, раманы і інш.).	Мастацкая вобразнасць, канкрэтнасць, эмацыянальнасць, маляўнічасць. Мае форму дыялога і маналога.	Ацэначны характар моўных сродкаў (эмацыянальна афарбаваная лексіка, словы з прамым і пераносным значэннем). Апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя і клічныя сказы. Сказы з аднароднымі членамі.

Репозиторий ВГУ

Тэма: Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання

Лексіка сучаснай беларускай мовы

Агульнаўжывальная

Словы, выкарыстанне якіх не залежыць ад месца жыхарства, прафесіі, сацыяльнага становішча людзей, не абмежавана моўнай сітуацыяй (стылем, жанрам, формай мовы), прыналежнасцю да той ці іншай часціны мовы: *холад, птушка, радасць, лёгкі, свежы, белы, варыць, піць, ехаць, сто, пятнаццаць, добра, моцна, яны, той* і інш.

Лексіка абмежаванага ўжытку

Словы, уласцівыя мове пэўнай тэрытарыяльнай або прафесійнай ці сацыяльна абмежаванай групе людзей. Малавядомыя або наогул невядомыя словы многім носьбітам мовы.

Дыялектная лексіка

Словы, ужыванне якіх абмежавана пэўнай тэрыторыяй, мясцовасцю: *дуйка* (завея), *гоўтацца* (прывыкнуць), *шума* (смецце) і інш.

Спецыяльная лексіка

Жаргонная лексіка

Штучныя, часам умоўныя словы або выразы, якімі карыстаюцца людзі, аб'яднаныя сацыяльнымі, прафесійнымі, бытавымі інтарэсамі (гандляры, спартсмены, паляўнічыя, маракі, навучэнцы і г.д.): *бабкі* (грошы), *стыпуха* (стыпендыя), *хвост* (акадэмічная запазычанасць).

Тэрміны

Словы або словазлучэнні, якія абазначаюць пэўныя паняцці з галіны навукі, тэхнікі, мастацтва і інш.: *штанга, гіпертрафія, манеж, марафон* і інш.

Прафесіяналізмы

Словы або выразы, уласцівыя мове прадстаўнікоў розных прафесій, спецыяльнасцей: "дворнік" (шклоачышчальнік), "камбуз" (кухня на судне), "гэблік" (рубанак),"спадак" (гатунак гліны) і інш.

Наменклатурныя назвы

Словы, якія толькі абазначаюць канкрэтныя аб'екты вывучэння розных навук, але не перадаюць сутнасць адпаведных навуковых паняццяў: *прыстаўкі* най-, па-, за-, пры- і інш.; халадзільнікі "Днепр", "Атлант", "Мінск-16" і інш.

Репозиторий ВГУ

Тэма: Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы

Асноўныя нормы беларускага літаратурнага вымаўлення і іх адлюстраванне на пісьме

Вымаўляецца	Пішацца	Правіла	Прыклад
[а] **[э]** **[а]** **[о]** **[а]** **[ы]**	**а** **э** **а** **о** **а** **ы**	**<u>Поўнае аканне</u>:** <u>ненаціскны</u> [о], [э] → [а] пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных. **Але!** **<u>У запазычаных словах</u>:** <u>ненаціскное</u> [э] захоўваецца <u>ненаціскны</u> [о] → [а] пасля зычных і ў пачатку слоў <u>ненаціскны</u> [о] захаваўся на канцы слоў пасля галосных. **Выключэнне!** **<u>Даўно запазычаныя словы</u>.** **<u>У</u> некаторых <u>іншамоўных і неіншамоўных словах</u>** [э] → [ы].	*[о] [а]* *Про́сьба – прасі́ць,* *[э] [а]* *прэ́сны – праснá́к.* *[э] [э]* *Элемéнт, інтэграл.* *[а] [а]* *Латарэ́я, лібрэ́та,* *[а]* *Адэ́са.* *[о] [о] [о]* *Трыо́, адáжыо́, Тóкіо,* *[о]* *Ватэрлóо.* *[а] [а]* *Харáктар, áдрас,* *[а] [а]* *сáкрэт, шáрэнга.* *[ы] [ы]* *Інжынéр, канцыля́-* *[ы] [ы]* *рыя, цырымóнія,* *[ы] [ы]* *пóчырк, гóрыч і інш.*
[а] **[э]** **[а]** **[а]**	**я** **е** **я** **я**	**<u>Няпоўнае яканне</u>:** пасля мяккіх зычных у 1-м складзе перад націскам [о], [э] → [а] (літару **я**). **Але!** **<u>У словах неславянскага паходжання</u>** і пасля **г, к, х** <u>яканне адсутнічае.</u> **<u>Даўно запазычаныя словы</u>** <u>яканню падпарадкаваліся.</u> **<u>Спрадвечнае я</u>** захоўваецца незалежна ад месца націску.	*[э] [а]* *Змéна – змянéнне,* *[о] [а]* *клён – клянóвы.* *[э] [э]* *Аперáцыя, сегмéнт,* *[э] [э]* *метрóвы, Херсóн.* *[а] [а]* *Сяржáнт, каляндáр,* *[а]* *дзяжу́рны.* *[а] [а] [а]* *Су́вязь, пяцярня́,* *[а] [йа]* *мéсяц, Ярасла́ў.*
[дз’] **[д]**	**[дз]** **д**	**<u>Дзеканне:</u>** [д] → [дз’] (пры змякчэнні). **Але!** **<u>У</u>** большасці **<u>іншамоўных слоў</u>** <u>дзеканне не адбываецца.</u>	*[д] [дз’]* *Ядро – ядзерны,* *[д] [дз’]* *легенда – легендзе.* *[д] [д] [д]* *Дэкан, дэбют, ордэн.*

Репозиторий БГУ

Вымаўляецца	Пішацца	Правіла	Прыклад
[ц’] **[т]**	**ц** **т**	**Цеканне:** [т]→ [ц’] (пры змякчэнні). **Але!** **У** большасці **іншамоўных слоў** цеканне не адбываецца.	*[т]* *Інстынкт – у* *[ц’] [т]* *інстынкце, шпагат –* *[ц’]* *на шпагаце.* *[т] [т] [т]* *Тэатр, тэма, тып,* *[т]* *авантура.*
[γ] **[г]**	**г** **г**	**Фрыкатыўны**, працяжны гук **г [γ]** (а ў рускай мове **выбухны** гук **г [г]).** **Выключэнне!** **У** нешматлікай **групе слоў** выбухны [г] у беларускай мове.	*[γ] [γ]* *Галава, дарога,* *[γ] [γ]* *пагнаў, госць.* *[г] [г] [г]* *Швагер, ганак, гуз,* *[г] [г] [г]* *гузік, гвалт, гарнец,* *[г] [г] [г]* *гонта, рэзгіны, розгі* *і інш.*
[γ], [в] **[о], [у]** **[о]** **[а], [і]**	**г, в** **о, у** **о** **а, і**	**Прыстаўныя гукі:** **Зычныя г, в** – перад каранёвым **у** і перад націскам **о**, у слове **гэты** і вытворных ад яго, у некаторых выклічніках і перад галоснымі ў пачатку адзінкавых назоўнікаў іншамоўнага паходжання. **Але!** Перад пачатковымі [о], [у] ў словах іншамоўнага паходжання і ўласных назвах, перад [у] прыставачным і перад [у], які развіўся з [в], прыстаўны [в] не ўзнікае. **Выключэнне!** **Галосныя а, і** – перад збегам зычных, першы з якіх **[м],** перад збегам зычных, які пачынаецца з **[р], [л],** калі слова ставіць • у пачатку сказа; • пасля знакаў прыпынку; • пасля папярэдняга слова на зычны.	*[в] [в] [в]* *Вузел, павук, вопыт,* *[в] [γ]* *Радзівон; дагэтуль,* *[γ] [γ] [γ] [γ]* *гэтакі, гэй, га, Ганна,* *[γ]* *гісторыя.* *[о] [у]* *Опера, унікальны,* *[у] [у]* *участак, унук.* *[о] [о]* *Одум, оканне,* *[о] [о]* *охаць, наогул.* *[і] [а]* *Імжа, амшары.* *[і]* *Іржой пакрылася* *жалеза.* *Купляюць хлеб,* *[а]* *пшанічны, аржаны...* *[а]* *Асушыць амшары.*

Репозиторий ВГУ

Вымаўляецца	Пішацца	Правіла	Прыклад
[й] **[ы]**	**і** **і**	**Але!** У пачатку слоў пасля галосных (калі пасля [і] няма цяжкага для вымаўлення збегу зычных) прыстаўны і непрыстаўны ненаціскны [і] → [й], а пасля зычных (акрамя *г, к, х*), калі пасля папярэдняга слова няма паўзы, пачатковы [і] → [ы].	*[й] [й]* *Яна ішла, Яна і я;* *[йі]* *да інстытута.* *[ы]* *Пад ільдом,* *[ы] [і]* *ад інстытута; смех і грэх.*
[ў] **[у]**	**ў** **у**	**<u>Змяненне гукаў</u>** **[у], [в], [л]** на **[ў]**: • пасля галосных ў пачатку, сярэдзіне і на канцы слоў; • пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны; • у сярэдзіне іншамоўных слоў пасля галосных, калі не ўтварае самастойнага склада. **Але!** <u>Змяненне гукаў не адбываецца:</u> • у пачатку сказа; • пасля зычных або знакаў прыпынку; • у пачатку ўласных назваў і абрэвіятурах; • у пачатку і ў фіналях іншамоўных слоў, калі ўтварае самастойны склад.	*[ў]* *Напісала ўчора,* *[ў] [ў]* *Салаўёў.* *[ў]* *Жанчына-ўрач, “Камсамольская* *[ў] [ў]* *праўда” ўзнагародзіла.* *[ў] [ў]* *Тайм-аўт, накаўт,* *[ў] [ў]* *накдаўн, аўкцыён,* *[у] [ў]* *Уздыму рукі ўверх.* *[у]* *Дзень у дзень,* *[у] [у]* *Яны сябравалі, удвух выконвалі заданні.* *[у]* *За Уралам, начальнік упраўлення крымі-нальнага вышуку* *[у][у]* *УУС.* *[у] [у]* *Да універсітэта, раут,* *[у] [у]* *натарыус,* *сауна,* *[у]* *фауна.*

Репозиторий ВГУ

Вымаўляецца	Пішацца	Правіла	Прыклад
[з’з’] **[с’с’]** **[ддз’]** **[ц’ц’]** **[жж]** **[чч]** **[шш]** **[л’л’]** **[н’н’]** **[л’]** **[с’]** **[н’]** **[л’]**	**зз** **сс** **ддз** **цц** **жж** **чч** **шш** **лл** **нн** **л** **с** **н** **л**	**<u>Падаўжэнне зычных</u>** Зычныя **[з’], [с’], [дз’], [ц’], [ж], [ч], [ш], [л’], [н’]** у спалучэнні з наступным **[j’]** (г.зн. тыпу ў рус. м. [сол’ ju] [сол’л’у] солью – у бел. м. соллю) у інтэрвакальным (г.зн. паміж галоснымі) становішчы **<u>падаўжаюцца</u>** **Але!** **<u>Не падаўжаюцца</u>** зычныя: • у словах лью, Ілья, Ульяна, Касьян і вытворных ад іх; • у словах іншамоўнага паходжання. **Выключэнне!** *<u>Ванна, манна, бонна, панна, Мекка, мецца, дурра</u>* (кармавая і хлебная расліна), *<u>донна, Мадонна.</u>*	*[з’з’]* *Маззю,* *[с’с’]* *воссю,* *[ддз’]* *асяроддзе,* *[ц’ц’]* *выццё,* *[жж]* *падарожжа,* *[чч]* *запечча,* *[шш]* *узвышша* *[л’л’]* *вяселле,* *[н’н’]* *апыленне.* *[с’] [н’] [л’]* *Сесія, тэніс, алея.*
[ж] **[ш]** **[дж]** **[ч]** **[р]** **[ц]**	**ж** **ш** **дж** **ч** **р** **ц**	**<u>Зацвярдзелыя зычныя</u>** **[ж], [ш], [дж], [ч], [р], [ц]** <u>вымаўляюцца заўсёды цвёрда.</u>	*[ж]* *Жыццё,* *[ш]* *вяршыня,* *[дж]* *джала,* *[ч]* *пачатак,* *[р] [р]* *рабро,* *[р] [ц] [р]* *рэцэптары.*
[дз’] **[дж]** **[д] і [з]** **[д] і [ж]**	**дз** **дж** **дз** **дж**	**<u>Гукі-афрыкаты</u> [дз’] і [дж]** <u>вымаўляюцца</u> як **<u>адзін гук</u>** (злітна), а **<u>не</u>** раздзельна [д – з] і [д – ж]. **Але!** На стыку марфем гукі [д – з], [д – ж] <u>вымаўляюцца раздзельна.</u>	*[дз’]* *Адзенне,* *[дж’]* *саджанец.* *[д][з]* *Падзарабіць,* *[д][ж]* *паджылкі.*

Репозиторий ВГУ

Вымаўляецца	Пішацца	Правіла	Прыклад
[б] **[п]** **[м]** **[ф]**	**б** **п** **м** **ф**	**Зацвярдзенне губных** зычных **[б], [п], [м], [ф]** на канцы слоў і перад **[j]**.	*[п] [бjэ]* *Голуб, б'ецца;* *[п] [пja]* *насып, п'яўка;* *[м] [мja]* *восем, сям'я;* *[ф] [фjу]* *верф, верф'ю.*
[тк] **[дз'б]** **[з'], [с']** **[дз'], [ц']** **[н']** **[шш]** **[жж]** **[шч]** **[ждж]** **[цц]** **[сс]** **[сц]** **[чч]** **[цц], [ц'ц']** **[цс], [ц'с']** **або** **[тс], [тс']**	**дк** **цьб** **з, с** **дз, ц** **н** **зш, сш** **зж** **зч, сч** **здж** **чц** **шс** **шц** **дч, тч** **дц, тц** **дс**	**Спалучэнне зычных** вымаўляюцца не ў адпаведнасці з напісаннем: • асіміляцыя (прыпадабненне) па звон. / глух.: "зв.+гл." = "гл.+гл." "гл.+зв." = "зв.+зв."; • асіміляцыя па мяккасці: змякчэнне зычных – свісцячых [з'], [с'], [дз'], [ц'], перад наступнымі мяккімі (акрамя [γ'], [к'], [х']); – зычных [н'] перад мяккімі свісцячымі [з'], [с'], [дз'], [ц']. **Увага!** На пісьме асімілятыўная (суседняя) мяккасць не абазначаецца. • Асіміляцыя па свісцячасці / шыпячасці: – свісцячыя [з], [з'], [с], [с'], [дз], [дз'], [ц], [ц'] перад шыпячымі [ж], [ш], [дж], [ч] прыпадабняюцца да шыпячых: "св. + шып." = "шып. + шып."; – шыпячыя [ж], [ш], [дж], [ч] перад свісцячымі прыпадабняюцца да свісцячых: "шып. + св." = "св. + св."; – зычныя гукі [д], [т] перад шыпячым [ч] прыпадабняюцца да шыпячага; – зычныя гукі [д], [т] перад свісцячымі [ц], [с] прыпадабняюцца да свісцячага.	*[тк] [д]* *Кладка (кладу);* *[дз'б] [ц]* *барацьба (барцы).* *[з'] [с']* *Змены, смелы;* *[дз'] [ц']* *дзверы, цвёрды.* *[з] [с] [с]* *Згінуць, скептык, схема.* *[н'] [н']* *Камандзір, на стэндзе.* *[шш] [шш]* *Узлезшы, бясшумна;* *[жж]* *разжыцца;* *[шч] [шч]* *паказчык, пясчынка;* *[ждж]* *прыезджы.* *[цц] [цц]* *Дачцэ, ручцы;* *[с'с']* *узнімешся;* *[сц]* *на дошцы.* *[чч]* *Даследчык,* *[чч]* *кулямётчык.* *[цц] [цц]* *Адцадзіць, хатцы,* *[ц'ц'] [ц'ц']* *ад цябе, адцерці.* *[цс] або [тс]* *Падсадзіць.* *[ц'с'] або [тс']* *Падсесці.*

Репозиторий ВГУ

Тэма: Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі

Прынцыпы сучаснай беларускай арфаграфіі
Прынцыпы арфаграфіі – пэўная заканамернасць, цесна звязаная з нацыянальнай спецыфікай мовы, на аснове якой будуюцца і аб'ядноўваюцца ў групы канкрэтныя правілы напісання.

Фанетычны прынцып	Марфалагічны прынцып	Традыцыйныя напісанні	Дыферэнцыраваныя напісанні
Напісанне таго ці іншага слова поўнасцю адпавядае яго вымаўленню: – аканне (*сэ́рца – сардэ́чны, во́ды – вада́*); – яканне (*сне́г – сня́жо́к, ве́чар – вячо́ркі*); – правапіс прыстаўных галосных і зычных (*імгла, аржаны, гэты, вузел*); – дзеканне і цеканне (*вада – вадзе, лета – у леце*); – правапіс падоўжаных зычных (*галлё, суддзя*); – правапіс **у – ў** (*пайшоў у аўдыторыю*) і інш.	Значымыя часткі слова (марфемы) заўсёды пішуцца аднолькава, незалежна ад іх вымаўлення: – правапіс звонкіх–глухіх [ш] [т] [с] (*лыжка, адказ,* [з] *просьба*); – правапіс цвёрдых – мяккіх зычных [з'] [ц'] [з] (*збіраць – збор*); – правапіс свісцячых–шыпячых зычных [жж] [ждж] (*зжаць,выязджаць*); – напісанне **е** ў прыназоўніку **без** і часціцы **не** [а] [а] (без веры, не быў і інш.).	Напісанні, якія перадаюцца на аснове этымалогіі і традыцыі: – правапіс літары **е** ў першым пераднаціскным складзе: а) у словах *дзевяты, дзесяты, семнаццаць, васемнаццаць* і вытворных ад іх; б) у словах неславянскага паходжання (*веранда, сезон, кераміка* і інш.); – напісанне з вялікай літары новага вершаванага радка і інш.	Дазваляюць адрозніваць сугучныя словы або іх формы, якія супадаюць: – напісанне вялікай і малой літары ў словах-амонімах – агульных і ўласных назоўніках (*танк – Танк, колас – Колас*); – напісанне галосных у канчатках аманімічных прозвішчаў і геаграфічных назваў у творным склоне (*з Іванóвым – пад Іванавам*) і інш.

Репозиторий ВГУ

Тэма: Сістэма часцін мовы.

Часціны мовы
Лексіка-граматычныя класы слоў, якія характарызуюцца агульнасцю значэння, марфалагічных прымет (або граматычнага значэння), словазмянення, словаўтварэння і сінтаксічнай ролі ў сказе.

Самастойныя (або знамянальныя) часціны мовы: назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў, прыслоўе	**Службовыя (або незнамянальныя) часціны мовы:** прыназоўнік, злучнік, часціца	**Па-за тыпамі часцін мовы:** выклічнік і гукаперайманне
• Маюць лексічнае значэнне. • Адказваюць на пэўнае пытанне. • Выконваюць сінтаксічную функцыю. • Характарызуюцца пэўнай сістэмай граматычных катэгорый.	• Не маюць самастойнага намінатыўнага значэння. • Не з'яўляюцца самастойнымі членамі сказа. • Не маюць граматычных катэгорый. • Служаць для выражэння рознага характару адносін паміж словамі сказа, словазлучэння, для перадачы граматычных значэнняў, семантычных адценняў і ўтварэння форм слова.	• Выражаюць розныя пачуцці і волевыяўленні, але не называюць іх ці перадаюць гукі жывой і нежывой прыроды. • Не з'яўляюцца членамі сказа.

Тэма: Асаблівасці будовы некаторых словазлучэнняў у беларускай мове (у параўнанні з рускай)

Асноўныя сінтаксічныя нормы беларускай мовы ў параўнанні іх з рускай мовай

№ п/п	У беларускай мове	У рускай мове
1.	*Выбачайце мне,* *прабачце яму,* *падзякаваць бацькам.* / **З. Д. скл.** назоўніка ці займенніка.	*Извините меня,* *простите его, поблагодарить родителей.* / **С. В. п.**
2.	*Ісці па дровы,* *паслаць па доктара,* *накіравацца па рыбу.* / Прыназ. **па + В. скл.** назоўніка ці займенніка. **Але!** *пайсці ў ягады (грыбы, кветкі, арэхі).* / Прыназ. **у + В. скл.**	*Идти за дровами,* *послать за доктором,* *направиться за рыбой.* / **за + Т. п.** *Пойти за ягодами (грибами, цветами, орехами).* / **за + Т. п.**

Репозиторий ВГУ

№ п/п	У беларускай мове	У рускай мове
3.	*Смяяцца з іх,* *пажартаваць з сябра,* *здзекавацца з чалавека,* *кпіць з суседкі.* / Прыназ. **з + Р. скл.** наз. (займ.).	*Смеяться над ними,* *подшутить над ними,* *издеваться над человеком,* *насмехаться над соседкой* / **над + Т. п.**
4.	*Жаніцца (ажаніцца) з Міхалінай (са Святланай).* / Прыназ. **з (са) + Т. скл.** наз. (займ.).	*Жениться (жениться) на Михалине (на Светлане).* / **на + П. п.**
5.	*Хварэць на шкарлятыну,* *захварэць на запаленне лёгкіх,* *хворы на сухоты,* *пакутаваць на ныркі.* / Прыназ. **на + В. скл.**	*Болеть скарлатиной,* *заболеть воспалением лёгких,* *больной туберкулёзом,* *страдать почками.* / **С Т. п.**
6.	*Хадзіць па дарогах,* *блукаць па лясах,* *змяняць па склонах,* *бачыцца па суботах,* *гладзіць па валасах.* / Прыназ. **па + М. скл.** наз. (займ.).	*Ходить по дорогам,* *бродить (блуждать) по лесам,* *изменять по падежам,* *видеться по субботам,* *гладить по волосам.* / **по + Д. п.**
7.	*Думаць пра яе,* *гаварыць пра будучыню,* *распытваць пра пачуцці.* / Прыназ. **пра + В. скл.** наз. (займ.).	*Думать о ней,* *говорить о будущем,* *расспрашивать о чувствах.* / **о (об) + П. п.**
8.	*Лекцыя па медыцыне,* *нарысы па мастацтве,* *адзнака па фізічным выхаванні* **Але!** *Адзнака за дыктант* / Прыназ. **па + М. скл.**	*Лекция по медицине,* *очерки по искусству,* *оценка по физической культуре,* *оценка по диктанту.* / **по + Д. п.**
9.	*Крокаў за дзесяць ад нас,* *за пяць вёрст ад вёскі.* / Прыназ. **за + В. скл.**	*Шагах в десяти от нас,* *в пяти верстах от деревни.* / **в + П. п.**
10.	*Лепшы за мяне,* *старэйшая за сястру,* *прыйшоў хутчэй за цябе,* *два градусы вышэй за нуль.* / Прыназ. **за + В. скл**. наз. (займ.)	*Лучше меня,* *старше сестры,* *пришёл быстрее тебя,* *два градуса выше ноля.* / **С Р. п.**
11.	*Два (тры, чатыры) добрыя студэнты (дні).* / У **Н. скл. мн. ліку** *Дзве цэлыя і тры чацвёртыя, чатыры дзесятыя.* / У **Н. скл.**	*Два (три, четыре) хороших студента (дня).* / **В Р. п. ед. ч.** *Две целых и три четвёртых, четыре десятых.* / **С Р. п.**

Репозиторий ВГУ

№ п/п	У беларускай мове	У рускай мове
12.	*Хвалявацца (перажываць, сумаваць* ***з-за каго****-небудзь.* / Прыназ. **з-за + Р. скл.** *Сумаваць* ***па*** *кім-небудзь.* / Прыназ. **па + М. скл**.	*Волноваться (переживать, грустить)* ***о*** *ком-либо.* / **о + П. п.**
13.	***Згодна з чым****-небудзь.* / **з + Т. скл.**	***Согласно чему****-нибудь.* / **С Д. п.**
14.	*Бачыць* ***на*** *свае вочы,* *чуць* ***на*** *свае вушы.* / Прыназ. **на + В. скл.**	*Видеть своими глазами,* *слышать своими ушами.* / **С Т. п.**
15.	***Што да*** *(чаго-небудзь, каго-небудзь),* ***то*** *...* **або** ***калі зайшла гаворка пра*** *(каго-небудзь, што-небудзь),* ***то*** *...*	***Что касается*** *(чего-нибудь, кого-либо),* ***то*** *...*

Заданні, практыкаванні і тэставы кантроль

Заданне 1. Устанавіце розніцу паміж наступнымі тэрмінамі:

славянскія мовы, усходнеславянская мова, беларуская нацыянальная мова, беларуская літаратурная мова. Абгрунтуйце свой адказ.

Заданне 2. Вызначце словы, якія адлюстроўваюць нацыянальную карціну свету беларусаў. Вусна растлумачце значэнне гэтых слоў.

1) Меднаствольі, як выліты, высіцца бор,
Зацвітае на ўзлеску блакітны чабор,
Заглядзелася сонца ў люстра азёр, –
Гэта ты, мая Беларусь! (П. Панчанка);

2) Глядзела маці, як цяжэла жыта, і ўспамінала ўсё, што перажыта, і гладзіла тугія каласы. (С. Грахоўскі);

3) Вёска тулілася ля берага вострава... (І. Мележ);

4) З другога боку, на поўнач, балоты крыху адступалі, дорачы людзям пясчанае поле. (І. Мележ);

5) Лес быў яловы... (У. Караткевіч);

6) Душу поўніла святочная радасць: вось ён, той даўно чаканы дзень. (І. Мележ);

7) Зямля і неба, звязаны дажджамі мы з роднай вёскай памяццю навек. (П. Панчанка);

8) Увесь светапогляд і паэзія нашых прадзедаў замыкаліся ў мове. (В. Ластоўскі).

Репозиторий ВГУ

Заданне 3. Выпішыце з тэксту словы з зычнымі гукамі, што складаюць адметнасць беларускай арфаэпіі. Падкрэсліце адпаведныя зычныя і вусна назавіце асаблівасць іх вымаўлення ў беларускай мове ў адрозненне ад рускай.

Мне здалося, што ты мяне аклікнула.
Але гэта быў толькі голас ветру,
Не голас ветру – а спуджанай птушкі,
Не спуджанай птушкі – а соннай галінкі,
Не соннай галінкі – а кроплі расы,
Не кроплі расы – а далёкага рэха.
Але я ўсё роўна штодзень
Іду міма вакон тваіх,
Каб яго яшчэ раз пачуць. (М. Танк)

Заданне 4. Перакладзіце на беларускую мову і пастаўце націск у словах. Адзначце разыходжанні ў іх акцэнтуацыі ў беларускай і рускай мовах.

Ворота, волосы, крапива, землю, верба, под воду, шофёр, окунь, на стену, коршун, фарфор, каталог, ольха, под гору, кишка, на ногу, поровну, на печи, арбуз.

Заданне 5. Запішыце згодна з арфаграфічнымі правіламі наступны тэкст.

[б'эларускаја мова спалучаецца ў саб'э z'іўнуjу м'акас'ц'/
а зрэтку й ц'в'ордас'ц' / зам'ілавануjу п'ашчотнас'ц' і шырокуjу
маўутнас'ц' / плаўнуjу п'авучас'ц' і хуткуjу дынам'ічнас'ц' /
старажытнас'ц' і маладос'ц'// у гэтай мов'э ўучыц' сэрца й душа народа /
добраўа / працав' ітаўа / с'ц' іплаўа й сумл'энаўа]. (Р. Гарэцкі).

Заданне 6. Запішыце, якія новыя значэнні набудуць дзеясловы, калі іх спалучыць са словамі ў дужках:

<u>адпусціць</u> *(дзяцей на каток, тавар пакупніку, бараду, жарт, сродкі на будаўніцтва);*

<u>завесці</u> *(у краму, гадзіннік, сабаку, размову, аўтамабіль, новыя парадкі);*

<u>прыйсці</u> *(на заняткі, у галаву, на свет, дарогай, да прытомнасці);*

<u>пусціць</u> *(птушку на волю, у адпачынак, завод, ваду, чутку, пыл у вочы);*

<u>разбіць</u> *(ворага, шкло, сад, надзеі);*

<u>скласці</u> *(дровы, ліст, кнігі, песню, зброю, печ, лікі, рукі, галаву, план, адказнасць).*

Репозиторий ВГУ

Заданне 7. Выберыце неабходнае па сэнсе слова і запішыце сказы. Вусна складзіце звязаны тэкст, выкарыстоўваючы, па магчымасці, прапанаваныя сказы.

1. *(Рэферы, рэферэнт) падбег да месца падзення мяча.*

2. *Ён быў спецыялістам высокага класа – сапраўдны (профі, прафан).*

3. *Дадзеныя (манітора, маніторынга) даюць уяўленне аб думках грамадскасці адносна гэтай праблемы.*

4. *Настойлівасць і працавітасць – важны (факт, фактар) дасягнення поспеху.*

5. *(Адрасат, адрасант) адправіў карэспандэнцыю своечасова.*

6. *Гэты (абанент, абанемент) дае вам права на наведванне басейна на працягу трох месяцаў.*

Заданне 8. Размяркуйце жанры адпаведна стылю ўжывання.

I. Навуковы	*1) анатацыя*	*11) эпіграма*
II. Афіцыйна-дзелавы	*2) пратакол*	*12) тэзісы*
III. Публіцыстычны	*3) фельетон*	*13) запіска сябру*
IV. Мастацкі	*4) рэферат*	*14) статут*
V. Гутарковы	*5) частушка*	*15) даведнік*
	6) рэпартаж	*16) даверанасць*
	7) быліна	*17) міф*
	8) дагавор	*18) пракламацыя*
	9) акт	*19) даведка*
	10) падручнік	*20) замова*

Заданне 9. Вызначце стыль, для якога характэрна наступная лексіка:

1) прыняць да ведама, ніжэйпадпісаныя, у адпаведнасці з, парадак дня, пералічананае вышэй, за справаздачны перыяд;

2) праблематыка пытання, з аднаго боку, варта падкрэсліць, прапарцыянальная залежнасць, можна зрабіць вывад, удзельная вага;

3) полымя гронак, сокал ясны, выспела нявеста, разгулялася мяцеліца, заціхаюць далі, рэкрут;

4) абяцанка-цацанка, хоць да раны прыкладай, газіроўка, крый божа, зліняў з урока;

5) эстафета пакаленняў, шырокія колы грамадскасці, армія беспрацоўных, культурныя кантакты, мірнае суіснаванне.

Репозиторий ВГУ

Заданне 10. Выберыце ўсе правільныя адказы:

I. Агульнаўжывальныя словы:

1) не абмежаваны месцам жыхарства людзей;
2) абмежаваны прыналежнасцю да пэўнай часціны мовы;
3) не абмежаваны сацыяльным становішчам і прафесіяй носьбітаў мовы;
4) абмежаваны моўнай сітуацыяй.

II. Лексіка абмежаванага выкарыстання:

1) мае спецыфічнае лексічнае значэнне;
2) уласціва мове пэўнай сацыяльнай групы людзей;
3) уласціва пэўнаму функцыянальнаму стылю;
4) абмежавана гістарычнай эпохай;
5) уласціва мове пэўнай тэрытарыяльнай групы людзей.

III. Спецыяльная лексіка:

1) тэрміны;
2) назвы прафесій, пасад;
3) дыялектызмы;
4) наменклатурныя назвы;
5) прафесіяналізмы.

IV. Спецыфічныя асаблівасці тэрмінаў:

1) сістэмнасць;
2) стылістычная нейтральнасць;
3) утварэнне толькі спосабам афіксацыі;
4) адназначнасць;
5) наяўнасць лічбавых сімвалаў;
6) незразумеласць носьбітам мовы;
7) наяўнасць дэфініцый (азначэнняў).

Заданне 11. Дапоўніце азначэнне

***Дыялектызм** – гэта ...*

***Жаргон** – сацыяльная разнавіднасць мовы, якой карыстаюцца ...*

Назвы, якія не перадаюць сутнасць адпаведных навуковых паняццяў, а толькі абазначаюць канкрэтныя аб'екты вывучэння розных навук, называюцца ...

Мова нізоў грамадства, дэкласавых груп і крымінальнага асяроддзя – гэта ...

Репозиторий ВГУ

Заданне 12. Вызначце, якія прадметы або з'явы названы паводле прозвішчаў і ўласных імёнаў.

Дальтан *(англійскі хімік і фізік);* ***Аксель*** *(нарвежскі канькабежац-фігурыст);* ***Дызель*** *(нямецкі інжынер);* ***Морзе*** *(амерыканскі вынаходнік);* ***Кардан*** *(італьянскі матэматык, філосаф, урач);* ***Цельсій*** *(шведскі астраном, фізік).*

Заданне 13. Устанавіце першапачатковае значэнне грэчаскай або лацінскай частак іншамоўных слоў. Пры дапамозе дадзеных запазычаных звязаных кампанентаў запішыце вядомыя вам тэрміны і вусна растлумачце іх семантыку.

Бія-, тэрма-, электра-, літа-, філа-, макра-, мега-, мікра-, неа-, мета-, мона-, полі-, радыё-, дэцы-, авія-, відэа-, імуна-, мілі-, турба-, фера-, вібра-, квазі-; -цэноз, -логія, -біёнт, -цыды, -філы, -трофы, -фіты.

Заданне 14. Размяркуйце наступныя тэрміны па трох асноўных тыпах паводле структуры:

а) тэрміны-словы;
б) тэрміны-словазлучэнні;
в) сімвалы-словы.

Успомніце і запішыце на кожны тып па 5–10 назваў-тэрмінаў (пажадана па спецыяльнасці).

Радыус акружнасці, сегмент, уран-235, атам, фазавае напружанне, нулявы патэнцыял, конус, с-падобная, β-распад, крышталізацыя,
α-часціца, цыліндр, селекцыя, эндэмічныя захворванні, эмульсія.

Заданне 15. Запішыце тэрміны, выражаныя словазлучэннямі, у адпаведнасці з наступнымі мадэлямі:

а) прыметнік + назоўнік;
б) назоўнік + назоўнік у назоўным склоне;
в) назоўнік + назоўнік ва ўскосным склоне без прыназоўніка;
г) назоўнік + назоўнік ва ўскосным склоне з прыназоўнікам.

Расшчапленне на фазы, блок-схема, гравітацыйная маса, ачыстка ад прымесей, канверсія газаў, сінхроннае поле, прэс-машына, звадкаванне газу, альфа-уран, сепаратар для вадкасці, вектар-параметр, восевая сіметрыя, сілкаванне ад акумулятара, гама-выпраменьванне, рэжым нагрузкі, насычанне кіслародам, газавая карозія, амплітуда пульсацый,

Репозиторий ВГУ

азонавы экран, ланцужок харчавання, парніковы эфект, антрапагенныя фактары, экалагічная катастрофа, насычаны раствор, кантынентальнасць клімату.

Заданне 16. Прыведзеныя ніжэй тэрміны з'яўляюцца запазычанымі паводле паходжання. Згрупуйце іх з улікам наступных прымет іншамоўных слоў:

I. Наяўнасць асобных гукаў *(**[ф]**; выбухнога **[г]**; пачатковага **[э]**; афрыкаты (злітнага гука) **[дж]**; пачатковага (і не толькі) **[ц]**; цвёрдых **[д]**, **[т]** перад этымалагічнымі [э], [і].*

II. Наяўнасць спалучэнняў гукаў:

*а) спалучэнні 2-х ці 3-х зычных (**[кт]**, **[кн]**, **[нд]**, **[ндр]** і інш.).*

*б) спалучэнне зычных з галосным (**ге, ке, хе; -аж, -юр; -бю, -вю, -пю** і інш.).*

*в) спалучэнне 2-х галосных (**іо (ыо), іа, ео (еа), уо, уа, іу (ыу)** і інш.).*

III. Наяўнасць іншамоўных:

*а) прыставак (**экстра-, рэ-, дыс-, ір-, ін-, інфра-** і інш.);*

*б) суфіксаў (**-ірав- (-ырав-), -імз- (-ызм-)** і інш.);*

*в) фіналяў (канцовак) (**-ус, -ум, -умф, -ўр, -ынг (-інг), -эр** і інш.);*

*г) афіксоідаў (**бія-, -граф, -грама, -тэка, геа-, -фон** і інш.).*

Вусна назавіце сферу ўжывання прапанаваных тэрмінаў.

Біясінтэз, гандбол, мадэрнізм, дысквалiфікацыя, кансіліум, хакей, генезіс, артэрыяльны, фаза, эндаскоп, асцылограф, гарсэт, тэрміналогія, цэйтнот, эфектыўны, гэбель, дэрматыт, кансервант, метрычны, кандыдат, дублікат, вундэркінд, цыферблат, істэрычны, праектар, манціраваць, антыпатыя, пілатаж, праектар, анемія, кансіліум, гербарый, інтаксікацыя, інстынкт, кафедра, бокс, джаз, каментатар, сеанс, таксікоз, пломба, сінтэзатар, інтэлект, дэфект, дыяграма.

Заданне 17. Укажыце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Растлумачце, у чым яны заключаюцца.

1. Пара памяняць навокольны антураж. 2. Ён быў бескарыслівым альтруістам. 3. Цяпер мы будзем супрацоўнічаць на аснове роўнага парытэту. 4. Брыфінг прайшоў даволі бурна і скончыўся праз два дні. 5. Настальгія па радзіме не давала ім спакою. 6. Перад ім паўсталі дзве альтэрнатывы: ісці ці не ісці на лекцыю. 7. Пасля ўрачыстай вячэры быў пададзены аперытыў. 8. Яго меркаванне – гэта даўно ўстарэлы анахранізм. 9. Дазвольце вам уручыць гэты сувенір на памяць! 10. Назвы ўстаноў былі выражаны скарочанымі абрэвіятурамі.

Репозиторий ВГУ

Заданне 18. Падбярыце беларускія адпаведнікі да іншамоўных слоў.

Іншамоўнае слова		Беларускі адпаведнік	
1.	*Сентыментальны*	А	*Перавага*
2.	*Фіялка*	Б	*Ветлівы*
3.	*Эскорт*	В	*Падарожжа*
4.	*Ілюзія*	Г	*Жыццярадасны*
5.	*Ліцэнзія*	Д	*Няўдача*
6.	*Інцыдэнт*	Е	*Абыякавасць*
7.	*Карэктны*	Ё	*Здарэнне*
8.	*Прыярытэт*	Ж	*Ахова*
9.	*Гуманны*	З	*Удасканаленне*
10.	*Мараторый*	І	*Перакананне*
11.	*Энтузіязм*	Й	*Памочнік*
12	*Турнэ*	К	*Праціўнік*
13.	*Кашнэ*	Л	*Дазвол*
14.	*Крэда*	М	*Шалік*
15.	*Імітацыя*	Н	*Надзея*
16.	*Апатыя*	О	*Захапленне*
17.	*Асістэнт*	П	*Забарона*
18.	*Аптымістычны*	Р	*Чуллівы*
19.	*Апанент*	С	*Падробка*
20.	*Рацыяналізацыя*	Т	*Чалавечны*

Заданне 19. Вызначце, якім спосабам утвораны наступныя жаргонныя словы (семантычнае пераасэнсаванне, запазычанне, скарачэнне слова, афіксацыя).

